РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 21 (30409)

# «ГЭТА ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНАЕ РАШЭННЕ ПА АБАРОНЕ НАШАГА СУВЕРЭНІТЭТУ»

## Прэзідэнт зацвердзіў рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы





Фота БелТА.

Традыцыйнае і вельмі важнае мерапрыемства прайшло ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы ў 2025 годзе. Да гэтага пытання мае дачыненне ўвесь сілавы блок краіны. Таму мерапрыемства зусім не пратакольнае.

СТАР. 2

АДПАЧЫНАК

# МЕСЦЫ Ў САНАТОРЫЯХ ПУСТАВАЦЬ НЕ БУДУЦЬ

## Якім чакаецца новы аздараўленчы сезон у беларускіх здраўніцах?

Сёлета ў Беларусі адкрыюцца два новыя дзіцячыя лагеры, а пяць санаторыяў прырастуць новымі карпусамі, павялічыўшы свой ложкавы фонд. Улічваючы павышаны попыт на санаторна-курортныя паслугі як на ўнутраным рынку, так і з боку замежных грамадзян, новыя месцы пуставаць не будуць. Мінулы год стаў рэкордным для айчынных здраўніц па ўсіх паказчыках, улічваючы запаўняльнасць. У нашых санаторыях летась адпачылі 1 мільён 565 тысяч чалавек. Адзін са складальнікаў такога высокага попыту — суадносіны даступнай цаны і высокай якасці медыцынскіх і аздараўленчых паслуг у беларускіх здраўніцах. І сёлетні год, калі браць да ўвагі цяперашнія тэндэнцыі, абяцае быць, прынамсі, не горшым.



### АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ

На люты ў беларускіх санаторыях забраніравана 71 % месцаў, на сакавік — 68 %, на красавік — 62 %, на май — 52 %. Ужо адкрыта браніраванне на летні перыяд. Акрамя таго, мяркуецца, што ў перыяд летняй дзіцячай аздараўленчай кампаніі лагеры розных тыпаў наведаюць больш як 400 тысяч дзяцей. У мінулым годзе ў летніх лагерах адпачылі 399 тысяч дзяцей.

— Улічваючы тую ж дынаміку росту попыту, мы думаем, што сёлета гэта лічба перавысіць 400 тысяч, — адзначыў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ**. — Фінансаванне ёсць. Упэўнены, што ўсе дзеці, якія маюць патрэбу і ахвоту, пройдуць аздараўленне ў перыяд летняй кампаніі 2025 года. На вясновых канікулах мы плануем аздаравіць у лагерах каля 70 тысяч дзяцей.

Генадзь Балбатоўскі паведаміў, што ёсць лагеры, у якія пуцёўкі разлятаюцца літаральна за дзень. Напрыклад, у дзень старту продажаў пуцёвак у «Зубраня» яны былі распрададзены, у прыватнасці на другую і трэцюю змены, якія карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. У два лагеры прадпрыемства «Гарызонт» у першы дзень анлайн-продажаў 19 тысяч карыстальнікаў захацелі набыць пуцёўкі, і сайт не справіўся з нагрузкай. Аднак пуцёўкі ў гэтыя лагеры можна ўзяць на першую, чацвёртую і пятую змены.

Акрамя таго, у новым аздараўленчым сезоне да 146 дзейных лагераў дададуцца два новыя. Таксама павялічыцца ложкавы фонд некаторых санаторыяў. Увогуле ж люты аб'яўлены месяцам лячэбна-аздараўленчага турызму. Будзе праведзена шмат мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю лячэбна-аздараўленчых устаноў. Зрэшты, беларускія санаторыі асаблівай патрэбы ў рэкламе не маюць. Аздараўлівацца прыязджаюць госці з усіх пяці кантынентаў: летась у нас пабывалі жыхары 63 краін свету, уключаючы Аўстралію, Паўднёвую Амерыку і Афрыку.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «ГЭТА ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНАЕ РАШЭННЕ ПА АБАРОНЕ НАШАГА СУВЕРЭНІТЭТУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**«Сённяшняе рашэнне — гэта не проста лінія дзяржаўнай граніцы на зямлі, па вадзе і ў паветры, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта найсур'ёзнейшае рашэнне па абароне нашага суверэнітэту і абароне нашай дзяржавы. Таму гэта перарасло ў добрую традыцыю».**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў гэтай справе бяруць удзел усе сілавыя структуры краіны — ад міліцыі да Міністэрства абароны. Ён растлумачыў гэта тым, што ахову дзяржаўнай граніцы працягласцю 3617 кіламетраў адны пагранічныя войскі забяспечыць не змогуць. Па словах кіраўніка дзяржавы, вельмі важна, каб пагранічнікі разам з абаронай дзяржаўнай граніцы яшчэ і своечасова папярэджвалі аб пагрозах. «Іншыя ведамствы таксама займаюцца гэтым пытаннем, але гэта задача нашых пагранічнікаў — папярэдзіць аб магчымых пагрозах нашай бяспецы. Тады, мабілізаваўшы ўсе сілы, якія ёсць у краіне: ад міліцыі да арміі, мы зможам супрацьстаяць праціўніку», — сказаў ён.

**Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сітуацыя на нашых граніцах няпростая: «Мы пра гэта ўвесь час гаворым і гаварылі. І работы сёння хапае не толькі пагранічнікам, але і мытнікам, асабліва на прапускных пунктах. Чэргі вялізныя і з аднаго, і з другога боку». Гэта, заўважыў ён, дадатковая нагрузка на нашых пагранічнікаў.**

«Я не па чутках ведаю, што такое пункты пропуску і зялёная зона, як ахоўваюць граніцу. Гэта ўсё няпроста. Таму сёння абмяркуем асноўныя моманты аховы дзяржаўнай граніцы, асноўныя элементы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дэталёва пацікаваўся сітуацыяй на граніцы і тым, якія пытанні трэба вырашыць для яе аховы. Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанцін Моластаў далажыў, што органы пагранічнай службы пастаянна праводзяць мерапрыемствы па павышэнні эфектыўнасці



Фота БелТА.

аховы граніцы, нарошчванні інжынернай інфраструктуры, аснашчэнні ўзбраеннем і тэхнікай, удасканаленні баявой падрыхтоўкі. У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Пагранічная бяспека на 2021—2025 гады» абсталяваны рубяжы аховы і аўтаматызаваны пасты тэхнічнага назірання, разгорнуты сігналізацыйныя сістэмы, устаноўлены датчыкі, якія хутка разгортваюцца.

Пачалі стварэнне высокатэхналагічнага падраздзялення на польскім участку граніцы на базе пагранічнай заставы імя Героя Савецкага Саюза лейтэнанта Андрэя Кіжаватава Брэсцкай пагранічнай групы. Фарміраванне такога падраздзялення дасць магчымасць значна павысіць надзейнасць аховы і перайсці ад патрулявання ўчастка да рэагавання на развіццё абстаноўкі ў рэжыме рэальнага часу, а таксама аптымізаваць штатную структуру.

**«Для павышэння эфектыўнасці прымянення ў ахове граніц пілатаванай і беспілотнай авіяцыі праведзена рэарганізацыя авіяцыйных падраздзяленняў, што забяспечвае цэнтралізаванае прымяненне аўтажыраў, іх тэхнічнае абслугоўванне і забеспячэнне. У падраздзяленнях граніцы ўведзены пасады аператараў беспілотных лятальных апаратаў», — праінфармавалі ў Дзяржпагранкамітэце.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### «Задача застаецца адна — надзейная ахова дзяржаўнай граніцы»

У размове з журналістамі **старшыня Дзяржпагранкамітэта Канстанцін МОЛАСТАЎ** адзначыў, што Прэзідэнт дэталёва ведае сітуацыю на дзяржаўнай граніцы па перыметры краіны.



«Сёння былі вызначаны задачы, мерапрыемствы не толькі для пагранічнікаў, але і для сілавога блока — усіх, хто працуе для абароны дзяржаўнай граніцы. Для пагранічнікаў, зыходзячы з абстаноўкі, якая складваецца, — шмат новага з улікам напружанасці вакол нашых граніц. Але задача застаецца адна — надзейная ахова дзяржаўнай граніцы», — паведаміў ён.

Па словах старшыні Дзяржпагранкамітэта, рэзкіх рухаў з боку суседзяў не назіраецца. Але напружанасць застаецца. «Органы пагранічнай службы няспынна ўдасканальваюцца. І ў плане тэхнічнага абсталявання, падыходаў да абароны дзяржаўнай граніцы. На сёння абарона дзяржаўнай граніцы — гэта глыбока эшаланаваная сістэма, гэта значыць, мы нясём службу не толькі па лініі дзяржаўнай граніцы, але і ўмацоўваемся ў прыгранічнай тэрыторыі», — сказаў Канстанцін Моластаў.








Тым часам

## Рост напружанасці каля заходніх граніц Беларусі і Расіі мае беспрэцэдэнтны характар

Аб гэтым заявіў на брыфінгу **начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ Андрэй СЕРДЗЮКОЎ,** паведаміла БелТА. «Захоўваецца значная прысутнасць кааліцыйных і нацыянальных войскаў у непасрэднай блізкасці ад граніц Беларусі і Расіі, нарастае іх ваенная актыўнасць, інтэнсіўнасць і маштабы сумесных вучэнняў. Актыўна ўдасканальваецца аператыўнае абсталяванне тэрыторыі рэгіёна з мэтай скарачэння тэрмінаў перагрупоўкі войскаў НАТА да граніц арганізацыі, — адзначыў Андрэй Сердзюкоў. — Замест пошуку альтэрнатыўных шляхоў палітычнага дыялогу пашыраецца спектр санкцыйных мер, што прымаюцца краінамі Захаду, развязваецца агрэсіўная інфармацыйная кампанія. Усё гэта сведчыць аб тым, што ва ўмовах глыбокай і імклівай трансфармацыі глабальнага светапарадку абстаноўка ў зоне адказнасці АДКБ і дынаміка яе змяненняў патрабуюць нашай павышанай увагі і гатоўнасці да адэкватнага і эфектыўнага рэагавання».

У Беларусі ў верасні плануецца правесці тры вучэнні АДКБ, паведаміў Андрэй Сердзюкоў. Пройдуць сумеснае вучэнне з Калектыўнымі сіламі аператыўнага рэагавання «Узаемадзеянне-2025», спецыяльныя вучэнні з сіламі і сродкамі разведкі «Пошук-2025», матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння «Эшалон-2025». «Пры гэтым задумы гэтых вучэнняў плануецца цесна ўвязаць з мэтамі сумеснага стратэгічнага вучэння Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Захад-2025», — падкрэсліў Андрэй Сердзюкоў.




# НЕ БОЛЬШ ЗА 0,5 БАЗАВАЙ



**Прэзідэнт Беларусі 30 студзеня падпісаў указ, якім устаноўлены гранічна дапушчальныя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі на 2025 год, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

У выніку жыллёва-камунальныя плацяжы для насельніцтва ў разліку на тыпавую двухпакаёвую кватэру з трыма пражываючымі пры нарматыўным спажыванні імі паслуг павысяцца ў 2025 годзе на 21 рубель (0,5 базавай велічыні).

Павышэнне тарыфаў праводзіцца ў два этапы:

з 1 студзеня — на ўсе паслугі, за выключэннем ацяплення і гарачага водазабеспячэння, на 17,05 рубля;

з 1 чэрвеня — на цеплавую энергію на мэты ацяплення і гарачага водазабеспячэння на 3,95 рубля.

У 2025 годзе ўдзельная вага жыллёва-камунальных плацяжоў у даходзе сям'і з трох чалавек пры двух тых, хто працуе і атрымлівае сярэднерэспубліканскую заработную плату, складзе 3,8 працэнта, сям'і з двух пенсіянераў — 8,3 працэнта.

Пры гэтым ва ўмовах росту жыллёва-камунальных плацяжоў будзе прадоўжана работа па дзяржаўнай падтрымцы насельніцтва праз выдзяленне безнаяўных жыллёвых субсідый.

Яны даюцца грамадзянам і сем'ям адрасна пры наступнай умове: калі штомесячная сума камунальных плацяжоў перавышае 20 % іх сярэднямесячнага сукупнага даходу ў горадзе і 15 працэнтаў — у сельскай мясцовасці.

# «СВЕДЧАННЕ ДАВЕРУ НАРОДА»

**На адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць віншаванні з пераканаўчай перамогай на выбарах.**

Віншаванні паступілі ад **Прэзідэнта Ірана Масуда Пезешкіяна, Прэзідэнта ААЭ шэйха Мухамеда бен Заіда аль-Нахаяна.** Прэзідэнта таксама павіншавалі **віцэ-прэзідэнт** і **прэм'ер-міністр ААЭ, кіраўнік Дубая шэйх Мухамед бен Рашыд аль-Мактум** і **віцэ-прэзідэнт, намеснік прэм'ер-міністра, міністр па справах Прэзідэнта шэйх Мансур бен Заід аль-Нахаян, Прэзідэнт Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Тхонглун Сісулі.**

Аляксандра Лукашэнку павіншавалі таксама **Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган, Кароль Бахрэйна шэйх Хамад бен Іса аль-Халіфа** і **Наследны прынц, прэм'ер-міністр гэтай краіны Сальман бен Хамад аль-Халіф.**

Віншаванні Прэзідэнту з нагоды перамогі на выбарах паступілі ад **старшыні Дзяржаўнага адміністрацыйнага савета, прэм'ер-міністра М'янмы Мін Аун Хлайна** і **ад старшыні Прэзідыума Босніі і Герцагавіны Жэлькі Цвіянавіч.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# БЕЛАРУСЬ — КЫРГЫЗСТАН: ЗАДАЧА — ВЫЙСЦІ Ў ТАВАРААБАРОЦЕ НА $500 МЛН

## Узаемны тавараабарот можа дасягнуць паловы мільярда долараў за найбліжэйшыя пяць гадоў

**У гэтым перакананы прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас сустрэчы са старшынёй Кабінета міністраў Кыргызстана — кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта Адылбекам КАСЫМАЛІЕВЫМ, якая адбылася ў Алматы.**


Фота БелТА.

Бакі адзначалі на сустрэчы, што Беларусь і Кыргызстан маюць падобныя падыходы да вырашэння многіх актуальных пытанняў як на двухбаковым трэку, так і ў рамках інтэграцыйных пляцовак і міжнароднага парадку дня.

Раман Галоўчанка выказаў упэўненасць, што цяпер вельмі добры час для таго, каб абмеркаваць вынікі мінулага года і расставіць пэўныя акцэнты ў агульнай дзейнасці на наступны перыяд.

— Эканамічная сфера заўсёды была прыярытэтнай для нашага супрацоўніцтва, бо дае канкрэтныя практычныя вынік для абедзвюх краін, — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Ён адзначыў, што за 11 месяцаў 2024 года тавараабарот паміж Беларуссю і Кыргызстанам узняўся да ўзроўню 2023-га і перавысіў 160 мільёнаў долараў.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў: трэба ўтрымаць гэтыя тэмпы, тым больш што патэнцыял у абодвух бакоў для гэтага ёсць.

— Выходзячы з напрацовак, якія маюцца, цалкам рэальна давесці тавараабарот за найбліжэйшыя пяць гадоў да 500 мільёнаў долараў, — выказаў упэўненасць Раман Галоўчанка. — Гэта досыць высокая планка. У нас ніколі такіх лічбаў не было. Але цяпер усе прымаем іх цалкам дасягальнымі, тым больш што ёсць добрая дынаміка ў рэалізацыі двухбаковых праектаў.

Прэм'ер-міністр адзначыў той факт, што назіраецца добрая дынаміка развіцця сумеснага праекта ў галіне ліфтавага абсталявання:

— У нас ёсць сумеснае прадпрыемства ў Кыргызстане, якое паспяхова выконвае пастаўленыя перад ім задачы.

Ён агучыў спадзяванне, што з улікам вялікай патрэбы Кыргызстана ў замене і абнаўленні ліфтавага абсталявання гэтае прадпрыемства будзе мець больш пакет заказаў, чым ёсць цяпер:

— Тым больш што лакалізацыя на прадпрыемстве досыць высокая, і мы настроены яе развіваць у далейшым, выкарыстоўваючы па максімуме камплектуючыя і вузлы, якія вырабляюцца ў Кыргызстане.

Раман Галоўчанка нагадаў, што гэтае ж прадпрыемства рэалізоўвае праект па будаўніцтве ротарнай паркоўкі, і выказаў упэўненасць, што ён будзе вельмі запатрабаваны жыхарамі сталіцы Кыргызстана.

Падчас сустрэчы беларускі прэм'ер закрануў яшчэ адну важную тэму — супрацоўніцтва ў сферы экалогіі, узаемадзеяння ў галіне абыходжання з адходамі і перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў. Ён адзначыў, што ў жніўні мінулага года ў горадзе Каракол адкрыўся смецеперапрацоўчы комплекс, які пад ключ быў пабудаваны беларускім прадпрыемствам, што дае магчымасць не толькі выконваць высокія экалагічныя стандарты, але і атрымліваць каштоўныя другасныя матэрыяльныя рэсурсы для вытворчасці новых запатрабаваных відаў прадукцыі.

Гаворачы аб патэнцыяле двухбаковага супрацоўніцтва, Раман Галоўчанка адзначыў, што Кыргызстан рэалізоўвае цяпер сур'ёзныя праекты, такія як будаўніцтва гідраэлектрастанцыі, распрацоўка новых радовішчаў, а таксама два буйныя чыгуначныя праекты.

Ён звярнуў увагу на тое, што Беларусь валодае сур'ёзнымі кампетэнцыямі як у праектаванні, так і ў аказанні паслуг па будаўніцтве такіх аб'ектаў (гаворка аб інжынірынгу, пастаўцы адпаведнай тэхнікі, пусканаладачных работах). Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што наша краіна гатова аказаць любое садзейнічанне партнёрам у гэтым пытанні, тым больш што для гэтага ёсць і надзейны фінансавы падмурак.

Нагадаем, што ў лістападзе 2024-га паміж банкамі развіцця Беларусі і Кыргызстана заключана пагадненне аб выдзяленні экспартных крэдытаў.

У тэму

Раман Галоўчанка наведвае з рабочым візітам Алматы (Казахстан) 30—31 студзеня, дзе ўдзельнічае ў пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета. Учора адбылося яго пасяджэнне ў вузкім складзе.

Таксама ў гэты дзень прэм'ер-міністр Беларусі сустрэўся з першым віцэ-прэзідэнтам Ірана Махамадам-Рэза Арэфам. Падрабязнасці — у наступным нумары «Звязды».

# КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ, І МІЖНАРОДНЫЯ

## Члены Савета Рэспублікі адобрылі шэраг важных дакументаў

На другой сесіі Савета Рэспублікі парламентарыі разгледзелі 9 законапраектаў, абмеркавалі міжпарламенцкую дзейнасць, а таксама азнаёміліся з кнігай «Наш Прэзідэнт».

Сярод законапраектаў, якія разгледзелі сенатары на пасяджэнні другой сесіі Савета Рэспублікі, — праект закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці». У ім карэкцірующца палажэнні Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў Беларусі, Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Карэктывы ўнесены для забеспячэння індывідуалізацыі крымінальнай адказнасці, узмацнення гуманістычнай накіраванасці крымінальнага закона, забеспячэння збалансаванасці яго нормаў.

Як паведаміў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Андрэй МАТЭЛЬСКІ**, галоўная мэта падрыхтоўкі гэтага законапраекта была вызначана Прэзідэнтам — зрабіць Крымінальны кодэкс больш справядлівым, каб ён дазваляў забяспечыць індывідуальны падыход пры прызначэнні пакарання: «Распрацаваны ў рамках выканання гэтага даручэння, у жніўні мінулага года законапраект быў унесены ў Палату прадстаўнікоў. Падчас работы над гэтым дакументам у парламенце ён быў аб'яднаны з праектам закона «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Беларусі». Законапраектам удасканальваюцца меры крымінальна-прававой адказнасці па шасці ключавых блоках».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ** адзначыў, што праект закона прадугледжвае карэкціроўку названых кодэксаў: «Як ужо казала Наталля Іванаўна (Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. — **«Зв.»**), у нашай краіне ў грамадзянскай супольнасці вельмі высокі запыт на справядлівасць пакарання, на забеспячэнне індывідуальнага падыходу да кожнага чалавека. Гэты запыт быў

> **Галоўная мэта падрыхтоўкі гэтага законапраекта была вызначана Прэзідэнтам — зрабіць Крымінальны кодэкс больш справядлівым, каб ён дазваляў забяспечыць індывідуальны падыход пры прызначэнні пакарання.**

### У тэму

Перад пасяджэннем другой сесіі Савета Рэспублікі для сенатараў была арганізавана прэзентацыя кнігі «Наш Прэзідэнт». **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** выказала ўпэўненасць, што кніга «Наш Прэзідэнт» стане для многіх у краіне настольнай: «26 студзеня ў нашай краіне прайшлі выбары Прэзідэнта Беларусі, і Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка атрымаў пераканаўчую перамогу. Мы чарговы раз засведчылі, што стратэгія развіцця нашай дзяржавы, абраная Прэзідэнтам, была правільнай. Гэта стратэгія, якая накіравана, перш за ўсё, на суверэнітэт, незалежнасць нашай краіны, на тое, каб беларусы жылі шчасліва. І народ у поўнай меры гэта ацаніў».

Спікер Савета Рэспублікі нагадала, што кніга «Наш Прэзідэнт» была прэзентавана напярэдадні выбараў: «Гэта выданне, на мой погляд, для многіх у нашай краіне будзе настольнай кнігай. Таму што гэта прыклад таго, як чалавек сваёй працай, сваім адказным стаўленнем да справы, сваёй любоўю да свайго народа, да кожнага ў нашай краіне дасягнуў такога ўзроўню ў сваім прафесійным росце, узначаліўшы краіну. Але самае галоўнае, што на працягу ўсяго яго жыцця ён захаваў любоў да сваёй краіны, свайго народа. І гэта вельмі важна. Ён паважае кожнага чалавека ў нашай краіне. Ён ганарыцца сваёй краінай. Я дакладна ведаю, у кнізе абсалютна ўсё правільна напісана: да апошняй кроплі крыві ён аддасць сваё жыццё на карысць свайго народа і сваёй краіны».

Пасля прэзентацыі кнігі сенатары падзяліліся ўражаннямі з журналістамі. **Член Пастаяннай камісіі Савета па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ала СМАЛЯК** адзначыла: «Кожны жыхар нашай краіны ганарыцца, што ў нас такі Прэзідэнт. Гэту кнігу павінен мець кожны беларус, і пры міжнародных візітах мы будзем дарыць яе калегам». У сваю чаргу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла САПЕГА** заявіла: «Прачытаць гэтую кнігу павінен кожны, бо і выбары паказалі, што Прэзідэнт у нас — народны. Кніга знойдзе свайго чытача — ад школьнікаў да дарослых людзей, якія будавалі гэту краіну разам з Прэзідэнтам».



Фота БелТА.

# ПЕРСПЕКТЫВЫ МІЖПАРЛАМЕНЦКАГА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ГОДА ДАБРАЎПАРАДКАВАННЯ

## На якіх пытаннях акцэнтаваў увагу Ігар СЕРГЯЕНКА

Дэпутаты абмеркавалі прапановы па праекце Плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання, падвялі вынікі папярэдняй работы на знешнім контуры, вызначылі перспектыўныя кірункі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння на бягучы год. Акрамя таго, парламентарыі разгледзелі пытанне, якое датычыцца работы міжведамаснай рабочай групы па ўдасканаленні мер сацыяльнай абароны ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

### «ПАДНЯЦЬ ГРАМАДЗЯН НА ГЭТУ РАБОТУ — НАША З ВАМІ ЗАДАЧА»

Як звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў, распачатая пяцігодка вызначана кіраўніком дзяржавы пяцігодкай якасці. «Яна прадугледжвае ўсебаковае пераўтварэнне, накіраванае на дасягненне высокіх стандартаў якасці жыцця, рост дабрабыту грамадства, павышэнне эфектыўнасці эканомікі, кіраўніцкай дзейнасці, аптымізацыю вытворчых працэсаў, атрыманне характарыстык тавараў, паслуг», — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка.

Спікер падкрэсліў, што Год добраўпарадкавання датычыцца не толькі арганізацый і дзяржавы. «Гэта датычыцца і грамадзян, — удакладніў ён. — Падняць грамадзян на гэту работу — наша з вамі задача, у тым ліку шляхам рэалізацыі нашых ініцыятыў».

Прапановы дэпутатаў у праект Плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025 годзе Года добраўпарадкавання агучыла **старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ.** Сярод іх — стварэнне Алеі памяці, прысвечанай дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, якія загінулі і зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны; інвентарызацыя нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцяў на тэрыторыі краіны; стварэнне інтэрактыўнай карты добраўпарадкавання.

«На ёй будуць адлюстроўвацца планы работы па добраўпарадкаванні, аб'екты добраўпарадкавання (паркі, скверы), інфармацыя аб бягучым стане аб'ектаў, — удакладніла дэпутат. — Прадугледжана магчымасць пакідаць свае прапановы і паведамляць аб праблемах. Доступ да карты будзе забяспечаны ў тым ліку праз мабільны дадатак. Карта пакажа, дзе ёсць праблемныя пытанні, якія патрэбна будзе аператыўна вырашаць».

> **Сярод ключавых мінулагодніх замежных камандзіровак парламентарыяў на чале са спікерам — камандзіроўкі ў Лаос і Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. Гэтыя і іншыя візіты, па словах старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, былі выкарыстаны і для актывізацыі двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін.**

> **Спікер падкрэсліў, што Год добраўпарадкавання датычыцца не толькі арганізацый і дзяржавы. «Гэта датычыцца і грамадзян, — удакладніў ён. — Падняць грамадзян на гэту работу — наша з вамі задача, у тым ліку шляхам рэалізацыі нашых ініцыятыў».**

### УМАЦАВАННЕ ПАЗІЦЫЙ І ПРАСОЎВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

Як праінфармаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ,** геаграфія паездак і шырокая праграма дзелавых міжнародных кантактаў дэпутатаў дакладна ўпісваецца ў агульную канву знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь, уплывае на ўмацаванне пазіцый нашай краіны на сусветнай арэне і прасоўванне яе нацыянальных інтарэсаў, перш за ўсё ў эканамічнай сферы.

«Безумоўным прыярытэтам міжнароднай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў стала пашырэнне ўзаемадзеяння з парламентарыямі Расійскай Федэрацыі і міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі, створанымі на постсавецкай прасторы, — адзначыў дэпутат. — Да ключавых па важнасці і змесце варта аднесці візіты парламенцкіх дэлегацый Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергяенкі ў Расійскую Федэрацыю для ўдзелу ў мерапрыемствах X Парламенцкага форуму БРІКС,

# ДАРОЖНЫ РУХ ПАГАДНЕННІ

пачуты Прэзідэнтам, які з улікам нармалізацыі крымінагеннай абстаноўкі ў краіне даў даручэнне распрацаваць адпаведны законапраект. І было паралельна дадзена даручэнне шырока абмеркаваць гэты законапраект з насельніцтвам нашай краіны. Усе члены Савета Рэспублікі актыўна ўключыліся ў гэту работу. Абмеркаванне палажэнняў праекта ў працоўных калектывах, на сустрэчах з грамадзянамі паказала, што карэкціроўка кодэксаў пазітыўна ўспрымаецца абсалютнай большасцю грамадзян. Пры гэтым на сустрэчах былі выказаны дадатковыя прапановы, якія старанна прапрацаваны ў Савеце Рэспублікі з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і дэпутацкім корпусам. У заключэнне адзначу, што ў праекце закона комплексна рэалізаваны прынцып індывідуалізацыі адказнасці. У суда з'явіцца вялікая варыятыўнасць выбару пакарання. Праект закона дэталёва быў разгледжаны на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі і дапрацаваны ў адпаведнасці з заўвагамі экспертаў».

> **Мэтай прыняцця законапраекта «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху» з'яўляецца карэкціроўка Закона «Аб дарожным руху» ў частцы давання права кіравання энерганасычанымі трактарамі і самаходнымі машынамі асобам, якія дасягнулі сямнаццацігадовага ўзросту. Прыняцце гэтых нормаў дазволіць навучэнцам устаноў, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, у перыяд вытворчай практыкі (за год да заканчэння вучобы) атрымаць права кіравання названымі трактарамі і самаходнымі машынамі.**

Акрамя таго, сенатары адобрылі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху». Як адзначыў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль ЛІНЕВІЧ**, мэтай прыняцця законапраекта з'яўляецца карэкціроўка Закона «Аб дарожным руху» ў частцы давання права кіравання энерганасычанымі трактарамі і самаходнымі машынамі асобам, якія дасягнулі сямнаццацігадовага ўзросту. Прыняцце гэтых нормаў дазволіць навучэнцам устаноў, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, у перыяд вытворчай практыкі (за год да заканчэння вучобы) атрымаць права кіравання названымі трактарамі і самаходнымі машынамі.

У сваю чаргу **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ** акцэнтаваў, што асноўнай задачай гэтага законапраекта з'яўляецца павышэнне ўзроўню забяспечанасці механізатарскімі кадрамі арганізацый аграрнага сектара і іншых галін эканомікі: «Законапраект неадназначна абмяркоўваўся на пляцоўках палат парламента, па ім маецца станоўчае заключэнне экспертызы. Законапраект накіроўваўся Прэзідэнту Беларусі і быў падтрыманы. Улічваючы важнасць і неабходнасць хутчэйшага прыняцця змяненняў і дапаўненняў у дзеючы Закон «Аб дарожным руху», члены Пастаяннай камісіі выказаліся аднагалосна і рэкамендуюць Савету Рэспублікі адобрыць разгледжаны законапраект».

Акрамя таго, Савет Рэспублікі адобрыў законапраект «Аб спажывецкім крэдыце і спажывецкай мікрапазыцы» і праект закона «Аб змяненні Закона «Аб дзяржаўным і мабілізацыйным матэрыяльных рэзервах». Ратыфікаваў: пагадненне Беларусі і КНР аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый; пагадненне Беларусі і Егіпта аб сістэме садзейнічання ўзаемнаму гандлю; пагадненне Беларусі і Нікарагуа аб супрацоўніцтве ў мытных справах; пагадненне Беларусі і Індыі аб супрацоўніцтве ў мытных справах; пратакол да пагаднення Беларусі і Кубы аб узаемных пастаўках.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# СУПРАЦОЎНІЦТВА, І ДАПАМОГА ЛІКВІДАТАРАМ

## падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў

у Ісламскую Рэспубліку Іран для ўдзелу ва ўрачыстай цырымоніі інаўгурацыі выбранага Прэзідэнта Ірана. У рамках гэтай паездкі былі таксама праведзены многія шматбаковыя сустрэчы, звязаныя з эканамічнымі інтарэсамі нашай краіны».

Сярод ключавых мінулагодніх замежных камандзіровак парламентарыяў на чале са спікерам — камандзіроўкі ў Лаос і Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. Гэтыя і іншыя візіты, па словах старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, былі выкарыстаны і для актывізацыі двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін.



Фота БелТА.

Акрамя таго, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў бралі актыўны ўдзел у маніторынгу рэферэндумаў і выбараў у Венесуэле, Азербайджане, Казахстане, Узбекістане і Грузіі.

«Аналіз здзейсненых камандзіровак у замежныя дзяржавы паказвае іх эфектыўнасць, накіраванасць на ўмацаванне міжнароднага пазіцыянавання Беларусі, арыентаванасць на прасоўванне нацыянальных інтарэсаў, у тым ліку ў гандлёва-эканамічнай сферы», — рэзюмаваў Сяргей Рачкоў.

### З КЛОПАТАМ АБ ЛІКВІДАТАРАХ

Што датычыцца работы міжведамаснай працоўнай групы па ўдасканаленні мер сацыяльнай абароны ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аб чым таксама ішла размова на Савеце Палаты прадстаўнікоў, яна была створана ў жніўні мінулага года.

Як патлумачыла Жанна Чарняўская, стварэнне міжведамаснай працоўнай групы звязана з вялікай колькасцю зваротаў, што паступаюць у Палату прадстаўнікоў ад гэтай катэгорыі насельніцтва. «Было прынята рашэнне адпрацаваць прапановы, якія паступілі да нас, вызначыць, што можна ўдасканаліць, правесці пэўную інвентарызацыю льготам, якімі сёння ўжо карыстаюцца людзі, — канкрэтызавала дэпутат. — Мы ўжо вызначыліся з кірункамі, па якіх нам неабходна папрацаваць сумесна з міністэрствамі і ведамствамі. У найбліжэйшы час паглядзім: гэта будуць змяненні ў заканадаўства або знойдзем іншы спосаб для таго, каб дапамагчы людзям».

**Вераніка КАНЮТА.**

## Задача ад Першага

> ***Ад становішча спраў на сяле ў многім залежаць дабрабыт нашых людзей, узровень харчовай бяспекі і ў выніку сацыяльна-палітычная стабільнасць у краіне. Людзі перш за ўсё павінны быць накормлены, апрануты — словам, жыць нармальна. Тады і будзе сацыяльна-эканамічная бяспека. У многім гэтаму спрыяе сельская гаспадарка. Сёння стаіць задача рухацца далей, зрабіць дзейнасць сельскагаспадарчай галіны больш устойлівай, а яе развіццё — прагрэсіўным.***
>
> *Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб развіцці сяла і павышэнні эфектыўнасці галіны. 16 красавіка 2024 года.*

# Запас трываласці гаспадаркі

Гэтым разам гаворка пойдзе пра гаспадарку па сучасных мерках зусім невялікую, па плошчы далёкую ад цяперашніх гігантаў галіны — ААТ «Мурава» Пружанскага раёна. Прадпрыемства трывала стаіць на нагах, устойліва развіваецца, яго работнікі атрымліваюць прыстойную зарплату, бачаць перспектыву, маюць магчымасць паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы. Вёскі, якія ўваходзяць у склад ААТ, выглядаюць па-сучаснаму.

ААТ «Мурава» займаецца вытворчасцю элітнага насення збожжавых культур, цукровых буракоў, алейнага насення рапсу, а таксама малака і адпаведна — кармоў. Гаспадарка дакладна рэагуе на патрабаванні рынку, тут укараняюць новыя тэхналогіі, развіваюць новыя вытворчасці.

**Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Мурава» Аляксандр МАРКЕЧКА** гаворыць:

— Каб вытворчасць развівалася, працягваем купляць новую тэхніку, абнаўляем парк. У тэхнічным парку стаўку робім на тэхабслугоўванне машын і механізмаў. Належнае і якаснае тэхабслугоўванне — самы танны і надзейны спосаб утрымання тэхнікі. Сэканоміш на гэтым — страціш на бясконцых пакупках запчастак. Ды і больш праслужыць любая машына, калі яе даглядаць па-гаспадарску.

— Працягнем будаўніцтва, — расказвае кіраўнік. — У канцы мінулага года запусцілі праект на ўзвядзенне новай сянажнай траншэі, хутка пачнём будаўніцтва. На стадыі завяршэння знаходзіцца праект будаўніцтва памяшкання для ўтрымання маладняку на жывёлагадоўчым комплексе. Для поўнага цыкла выгадоўвання — ад маленькага цяляці да каровы — у нас не хапае аднаго будынка. Сёлета плануем яго ўзвядзенне.

Варта сказаць, што ў «Мураве» многае робіцца сваімі сіламі. Ёсць будаўнічая брыгада. Калі трэба абсталяваць склад, адрыну для сена, зрабіць вароты альбо лаўкі каля фермы, правесці афармленне таго ці іншага аб'екта, тут спраўляюцца самастойна. Бо прыцягнуць да ўказанай работы староннюю спецыялізаваную арганізацыю абыдзецца ў разы даражэй.

— У галіне раслінаводства на першы план выходзіць дакладнае захаванне тэхналогій і беражлівае стаўленне да зямлі, — працягвае дырэктар. — На дапамогу чалавеку прыйшла разнастайная тэхніка. Але ж нязменным застаецца адно — сумленнасць працаўніка, шчырасць у адносінах да зямлі, а яшчэ дакладны эканамічны разлік. Пералічанае ўяўляе сабой галоўныя прынцыпы гаспадарання, якія склаліся на працягу дзесяцігоддзяў дзякуючы нашым папярэднікам. А мы, цяперашняе пакаленне працаўнікоў, падтрымліваем традыцыі, на іх аснове развіваем вытворчасць, рэалізоўваем новыя ідэі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



# «ПРЫГАЖОСЦЬ ПАЧЫНАЕЦЦА З МАЛОГА»

**Пытанням навядзення парадку на зямлі на Міншчыне ўдзяляецца самая пільная ўвага. Кіраўніцтвам вобласці штогод распрацоўваецца і зацвярджаецца адпаведны план. Акрамя таго, 2025-ы, абвешчаны кіраўніком дзяржавы Годам добраўпарадкавання, дае старт пяцігодцы якасці і прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне і падтрыманне зручнага, бяспечнага, сучаснага і эстэтычна арганізаванага асяроддзя жыццядзейнасці людзей. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, якія мерапрыемствы будуць ажыццяўляцца ў гэтым кірунку ў Мінскай вобласці.**




«Удзел у добраўпарадкаванні нашых населеных пунктаў зможа ўзяць кожны неабыякавы чалавек, у тым ліку падчас правядзення рэспубліканскіх суботнікаў, а іх сёлета будзе два. Назапашаны вялікі вопыт узаемадзеяння з грамадскімі арганізацыямі: ад ветэранскіх да маладзёжных», — расказала **старшыня камітэта Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына ПАЛЯШЧУК**.

У Год добраўпарадкавання на Міншчыне будзе высаджана больш за 100 тысяч дрэў і кустоў, 3,5 мільёна кветак, рэканструявана 19 гектараў газонаў, праведзена азеляненне тэрыторый уздоўж аўтадарог. Зыходзячы з гэтага, плошча такіх тэрыторый павялічыцца больш чым на 17 тысяч квадратных кіламетраў. «Плануюцца работы па санітарнай ачыстцы паверхневых водных аб'ектаў, утрыманні месцаў масавага адпачынку каля вадаёмаў, мерапрыемствы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, сярод якіх — асвятленне вуліц, рамонт і ўладкаванне кантэйнерных пляцовак, спартыўных і гульнявых пляцовак, альтанак, лавак і таму падобнага», — адзначыла старшыня камітэта.

Не абыдуць бокам мерапрыемствы па добраўпарадкаванні сельскагаспадарчых тэрыторый, садовых таварыстваў і гаражных кааператываў, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, месцаў адпачынку. «Кожны жыхар можа зрабіць свой унёсак у навядзенне парадку на зямлі, каб Год добраўпарадкавання стаў сімвалам клопату пра будучыню. А прыгажосць пачынаецца з малога — з кожнага двара, вуліцы, парку», — падкрэсліла Кацярына Паляшчук.

Сёлета ў Мінскай вобласці пройдзе 18-ы рэспубліканскі экалагічны форум, які прыме горад Дзяржынск. Гаворачы аб выніках мінулага года, старшыня камітэта адзначыла: «Летась былі праведзены работы па добраўпарадкаванні, у тым ліку адрамантаваны 225 спартыўных і дзіцячых пляцовак, 459 кантэйнерных пляцовак, устаноўлена і адрамантавана звыш 2,5 тысячы кантэйнераў, а таксама звыш 490 тысяч квадратных метраў вулічна-дарожнай сеткі».

На Міншчыне пасаджаны больш за 90 тысяч дрэў і кустоў, больш за мільён кветак, рэканструявана 18 гектараў газонаў: «За апошнія пяць гадоў працэнт азелянення гарадоў і райцэнтраў вобласці дасягнуў 44 %».

Таксама праведзены работы па ўтрыманні ў належным стане 120 месцаў і зон адпачынку на водных аб'ектах вобласці. «У рэгіёне развіваецца экалагічны турызм, уладкоўваюцца экасцежкі, з'яўляюцца турыстычныя прыпынкі на тэрыторыі нацыянальных паркаў і заказнікаў. Напрыклад, у заказніку «Налібоцкі» распрацаваны два экалагічныя маршруты, а ў ландшафтным заказніку рэспубліканскага значэння «Сялява» летась была адкрыта абноўленая экасцежка «Прошыцкія балоты», — адзначыла Кацярына Паляшчук. — На тэрыторыі вобласці 278 асабліва ахоўных прыродных тэрыторый агульнай плошчай звыш 298 тысячы гектараў, або 7,5 % ад агульнай плошчы рэгіёна. У мінулым годзе на гэтых тэрыторыях праведзены работы па ўстаноўцы 131 інфармацыйнага знака, абсталяваны 42 вогнішчы і мангалы, уладкаваны і адрамантаваны сем аўтапаркавак».

Старшыня камітэта дадала, летась у Мінскай вобласці былі праведзены работы па ўладкаванні 25 веладарожак працягласцю больш за 65 кіламетраў, пабудавана 79 велапаркovак і велагаражоў: «Улічваючы павелічэнне электратранспарту ў рэгіёне, уведзена ў эксплуатацыю 51 станцыя для зарадкі. Характэрна, што 15 такіх станцый былі ўведзены ў Жодзіна, у тым ліку для зарадкі электробусаў, якія працуюць на гарадскіх маршрутах».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# АБ'ЕКТЫ, ЯКІХ ВЕЛЬМІ ЧАКАЮЦЬ

## Гомельшчына атрымае некалькі мастоў

**У Гомельскай вобласці поўным ходам ідзе аднаўленне і будаўніцтва адных з самых працяглых у краіне пешаходнага і аўтамабільнага мастоў.**



Працягласць пуцеправода для пешаходаў, пабудаванага ў абласным цэнтры ў 1987 годзе сіламі прадпрыемства «Гомсельмаш», — 550 метраў. Ён праходзіць ад вуліцы Кірава да вуліцы Дворнікава і злучае мікрараёны Гомсельмаш і Стары Аэрадром. За больш чым 35 гадоў эксплуатацыі пуцеправод перастаў адпавядаць патрабаванням бяспекі. З першага жніўня мінулага года аб'ект закрыты на капітальны рамонт. Аднаўленчыя работы на ім вядуцца адначасова з двух бакоў. Праектам аднаўлення прадугледжана ўмацаванне пралётных збудаванняў, замена агароджы, прывядзенне ў парадак лесвіц і іншыя віды работ. Цяпер будаўнікамі вядзецца мантаж навясных канструкцый, якія будуць засцерагаць пешаходаў ад ападкаў і ветру. Упершыню будзе забяспечана асвятленне. Новы выгляд ужо набылі лесвіцы, якія вядуць да пуцеправода. Пры іх узвядзенні ўлічана карыстанне аб'ектам маламабільных людзей, веласіпедыстаў, пешаходаў з дзіцячымі каляскамі. Раней узнікалі цяжкасці пры пад'ёме на пуцеправод. Цяпер з двух бакоў прадугледжаны пандус і лесвіца з больш пакатым ухілам. Плануецца, што самы працяглы ў Беларусі пешаходны мост будзе адкрыты пасля капрамонту вясной бягучага года.

У Веткаўскім раёне поўным ходам ідзе будаўніцтва важнейшага для раёна аб'екта, які злучае райцэнтр і Гомель, — моста праз раку Сож. Праект уключылі ў дзяржпраграму «Дарогі Беларусі», яго рэалізацыя вядзецца ў некалькі этапаў. Рух па старым мосце працягваецца, але ён аднапалосны і з абмежаваннямі. У 35 метрах ад дзейнага аб'екта вядзецца будаўніцтва новага моста. Яго працягласць складзе 537 метраў, а шырыня — 10 метраў, што зробіць рух зручнейшым і бяспечным. Мост будзе разлічаны на любыя віды транспарту.

Адзін з самых глабальных і чаканых жыхарамі Гомельшчыны праектаў мостабудавання — другі па працягласці ў краіне аўтамабільны мост праз Прыпяць у Мазыры. Гэта найважнейшая транспартная артэрыя дапамагае на 25 кіламетраў скараціць адлегласць паміж Мазыром і Калінкавічамі. Мостабудаўнічыя пляцоўкі знаходзяцца тут на двух берагах Прыпяці і захопліваюць у тым ліку акваторыю ракі, у работах задзейнічаны флот Беларускага рачнога параходства. Адкрыццё гэтага маштабнага аб'екта чакаецца ў другім паўгоддзі бягучага года.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**

извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Авиакомпания Гродно»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 12.02.2025 г.**

**Лот № 1:** авиадвигатель АШ-62ИР К16272140 (инв. № 0000001204, заводской № К16272140, год выпуска 1982) Начальная цена с НДС 20 % – 40 948,23 руб. Задаток – 4 094,82 руб.

**Лот № 2:** авиадвигатель АШ-62ИР К16436108 (инв. № 0000011071, заводской № К16436108, год выпуска 1986). Начальная цена с НДС 20 % – 40 948,23 руб. Задаток – 4 094,82 руб.

**Лот № 3:** авиадвигатель АШ-62ИР К16364148 (инв. № 0000001212, заводской № К16364148, год выпуска 1984). Начальная цена с НДС 20 % – 40 948,23 руб. Задаток – 4 094,82 руб.

**Лот № 4:** авиадвигатель АШ-62ИР К16395148 (инв. № 0000001227, заводской № К16395148, год выпуска 1985). Начальная цена с НДС 20 % – 40 948,23 руб. Задаток – 4 094,82 руб.

**Лот № 5:** авиадвигатель АШ-62ИР К16447192 (инв. № 0000001215, заводской № К16447192, год выпуска 1987). Начальная цена с НДС 20 % – 40 948,23 руб. Задаток – 4 094,82 руб.

**Местонахождение Лотов 1-5:**
Республика Беларусь, Гродненский р-н, Гродненская обл., Аэропорт

**Шаг электронных торгов – 5 %.**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 07.02.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**

извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Авиакомпания Гродно»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 13.02.2025.**

**Лот № 1:** планер Ан-2 EW84727 (Инв.№0000001175, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-84727, заводской № 1Г20145, 1983 г., установлены: авиационный двигатель АШ-62ИР (заводской №К1623101, инв. № 0000011072), воздушный винт АВ-2 (заводской №Н062300480) Начальная цена с НДС 20 % – 83 760,00 руб. Задаток – 8 376,00 руб.

**Лот № 2:** планер Ан-2 EW 07428 (инв. № 0000001169, тип АТ и рег. знак – Ан-2П EW-07428, заводской № 1Г15103, 1973 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (заводской № 16282149, инв. № 0000001246), воздушный винт АВ-2 (заводской № W478034). Начальная цена с НДС 20 % – 69 360,00 руб. Задаток – 6 936,00 руб.

**Лот № 3:** планер Ан-2 EW33583 (инв. № 0000001182, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-33583, заводской № 1Г23020, 1988 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (заводской № К1636488, инв. № 0000001211), воздушный винт АВ-2 (заводской № Н048420130). Начальная цена с НДС 20 % – 83 760,00 руб. Задаток – 8 376,00 руб.

**Лот № 4:** авиадвигатель АШ-62ИР (инв. № 0000001218, заводской № К16467133, 1987 г.). Начальная цена с НДС 20 % – 45 372,00 руб. Задаток – 4 537,20 руб.

**Местонахождение Лотов 1-4:** Республика Беларусь, Гродненский р-н, Гродненская обл., Аэропорт.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 10.02.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 95 %**

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1** УНП 491382947

**Продавец: КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В. В.**

Торги состоятся 13 февраля 2025 года в 11-00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.

Подробный перечень имущества с ценами в количестве 19 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе «Аукционы» – «Очные торги».** Дополнительное размещение на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by в разделе «Экономика / Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества». Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 03.02.2025 по 11.02.2025 с 9.00 до 16.00. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 06.04.2023 г. №14, в газете «Звязда» от 06.04.2023 г. № 69 (30203). Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по тел.: **8 (033) 634-86-95** Насонов Николай Владимирович – правовая информация, запись на осмотр имущества; **8 (029) 835-67-42** Насонов Владимир Валерьевич. Контактные данные: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, **8 (029) 651-22-19**, 8 (029) 694-43-89. **E:mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

# ДЛЯ КАМФОРТУ ЖЫХАРОЎ І ЧЫСЦІНІ ПРЫРОДЫ

Як у Гродзенскай вобласці будуць паляпшаць экалагічнае асяроддзе



**Завяршаецца першы месяц Года добраўпарадкавання, які дае старт Пяцігодцы якасці. У азначаным кірунку будуць прыкладацца намаганні дзяржавы, арганізацый, усіх грамадзян. Размова — пра развіццё інфраструктуры, навядзенне парадку, захаванне навакольнага асяроддзя. Такая работа сёлета павінна стаць больш эфектыўнай, а мерапрыемствы больш маштабнымі і ахопліваць розныя сферы і аб'екты.**
**Аб планах рэгіёна на сёлета расказаў намеснік старшыні Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр АДАМЕНКА.**

## З «ЗЯЛЁНЫМ» АКЦЭНТАМ

Важнае месца ў найбліжэйшыя 12 месяцаў адводзіцца азеляненню тэрыторый. На сённяшні дзень усе населеныя пункты вобласці па гэтым паказчыку дасягнулі 40 %, што забяспечвае спрыяльныя ўмовы для пражывання. Але колькасць зялёных насаджэнняў будзе павялічвацца. У гэтым годзе мяркуецца азеляніць яшчэ больш за 10 тысяч квадратных метраў.

— Летась было пасаджана звыш 50 тысяч дрэў і кустоў. Сёлета планы не меншыя. Плануецца ў два разы больш азеляніць тэрыторыю населеных пунктаў. Мяркуецца правядзенне



некалькіх рэспубліканскіх суботнікаў. Акрамя іх, будуць і лакальныя, у тым ліку арганізаваныя камітэтам прыродных рэсурсаў. Работу будзем працягваць і актывізаваць, — расказаў Аляксандр Адаменка.

Працягнецца закладка алей, пасадка дэкаратыўных кустоў, стварэнне і аднаўленне клумб і газонаў, устаноўка малых архітэктурных форм. Вялікая ўвага будзе аддавацца кампенсацыйным пасадкам і азеляненню мікраранаў новай забудовы, а таксама добраўпарадкаванню гарадскіх лясных зон.

Дарэчы, летась у вобласці было высаджана звыш мільёна кветак, сёлета гэта лічба павялічыцца ў 2,5 раза.

## ПАРАДАК ПЛЮС ВЫГАДА

У Гродзенскай вобласці 48 % цвёрдых бытавых адходаў ідзе ў перапрацоўку. Гэта самы высокі паказчык па рэспубліцы, у сярэднім па краіне ён складае 37 %. На сёлета планы яшчэ больш амбіцыйныя. Мяркуецца дабіцца перапрацоўкі 61 % адходаў. Гэта стане магчымым за кошт новых схем па рабоце з адходамі.

— У Ваўкавыску будуецца новы завод па сартыроўцы смецця, які будзе спрыяць дадатковым аб'ёмам перапрацоўкі. Летась пачала працаваць лінія па выпуску RDF-паліва (з адходаў). Плануецца, што сёлета яго аб'ёмы вырастуць. Будзе ўдасканальвацца лагістыка, закупляюцца новыя кантэйнеры і смеццевозы, — паясняе алгарытм работы суразмоўца.

Разам з тым шмат увагі аддаецца стыхійным сметнікам. За год іх па вобласці выяўляецца 10-15 тысяч. Вінаватых часта ўдаецца знайсці дзякуючы відэакамерам. Сёлета колькасць відэакамер павялічыцца.

— Калі знаходзім тых, хто стварыў сметнік, прыцягваем да адказнасці і застаўляем прыбіраць. Апошнім часам прадугледжана пакрыццё страты і за шкоду прыродзе незалежна ад таго, юрыдычная гэта асоба альбо фізічная.

Многіх парушальнікаў можна вызначыць па нумарах машын, якія трапляюць на відэакамеры. Напрыклад, у лясным фондзе 100 % тэрыторыі ахоплены камерамі прагляду, — падкрэсліў прадстаўнік прыродаахоўнага ведамства.

## «ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» І ШТРАФЫ

Жыхары Гродзеншчыны неабыякавыя да навакольнага асяроддзя. Аб гэтым сведчыць і вялікая




колькасць званкоў, якія паступаюць на «гарачую лінію» экалагічнага ведамства. Працуе яна з 9 да 18 гадзін штодня, у тым ліку ў выхадныя і святочныя дні. Людзі тэлефануюць па розных пытаннях. Напрыклад, інфармуюць пра незаконную вырубку дрэў, стыхійныя сметнікі, пра дзікіх жывёл і птушак, якім патрэбна дапамога, альбо з якімі звязана небяспека...

Ёсць жыхары, якія супраць таго, каб хтосьці садзіў дрэвы. Такія пытанні вырашаюцца сумесна з землекарыстальнікамі. Калі гэта кампетэнцыя эколагаў, спецыяліст выязджае на месца.

— Нядаўна, напрыклад, быў званок з Мастоў, паведамлялі аб сцёках з прадпрыемства ў Нёман. Нашы спецыялісты знайшлі, адкуль ішлі сцёкі, выявілі, што гэта была ліўнёўка. Гэта парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства, таму будуць адпаведныя санкцыі, — паведаміў Аляксандр Адаменка.

Самы вялікі штраф летась дадзены сельскагаспадарчаму прадпрыемству ў Слонімскім раёне за забруджванне зямель ляснога фонду. Падлічана, што страта, якая нанесена прыродзе, склала 200 тысяч рублёў. Летась зафіксавана 1,5 тысячы правапарушэнняў, прад'яўлена больш за 270 прэтэнзій на суму амаль тры мільёны рублёў. Спагнана 95 % штрафаў.

— Сумы вялікія, і яны растуць з кожным годам, — заўважае прадстаўнік ведамства. — Гэта звязана з тым, што работа ў гэтым кірунку ўзмоцнена. Мы ўносім прапанову прымаць да парушальнікаў яшчэ больш жорсткія меры. Павялічваць штрафныя санкцыі, напрыклад.

Таксама ў камітэце паведамілі, што ў першым паўгоддзі спецыялісты ведамства возьмуць удзел у больш чым 40 праверках суб'ектаў гаспадарання Гродзенскай вобласці. Праверкі ўключаюць кантроль за выкарыстаннем і аховай водных і зямных рэсурсаў, атмасфернага паветра, звароту з адходамі, аховай раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу. Большая частка праверак будзе датычыцца сферы АПК. Пры парушэннях прадугледжаны штраф для службовых асоб — 30 базавых велічынь, індывідуальных прадпрымальнікаў — 200, а для юрыдычных асоб штраф можа дасягаць 1000 базавых велічынь. Летась, напрыклад, было праверана 77 суб'ектаў гаспадарання, большасці з якіх выдадзены прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов 2025.Г.002.00038 по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** РУП «Витебский ЦСМС», 210015, Республика Беларусь, г. Витебск, ул.Б. Хмельницкого, 20, 8 0212 48-04-19.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 04.03.2025** в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Легковой автомобиль МАЗДА 6, 2008 года выпуска, выданы регистрационные знаки для транспортных средств, временно допущенных к участию в дорожном движении 2ЕМТ5810, кузов (рама) JMZGH128201200178, цвет – синий, инвентарный № 127000332.

**Местонахождение имущества**: Витебская область, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 20.

**Начальная цена:** 22080,00 бел. руб. с НДС 20 %. **Задаток:** 2208,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 03.03.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09:00 до 16:00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (44) 5148455 – Кулик Александр Николаевич.

УНП 390477566

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **2025.Г.002.00030** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Речицкому району, 247500, Гомельская обл., г. Речица, пл. Октября, 4, тел. 80234030322.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 28.02.2025** в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Легковой автомобиль SAMAND TU5, 2012 г. в., тип – легковой автомобиль седан (sedan), кузов (рама) № Y3W2PSMTUCUNS1432, цвет – серый металлик, инв. № 01510013. Выданы регистрационные знаки для транспортных средств, временно допущенных к участию в дорожном движении 3ТМ0001260. Местонахождение имущества: Гомельская область, г. Речица, пл. Октября, 4.

**Нач. цена**: 3433,11 бел. руб. без НДС.
**Задаток:** 343,31 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.02.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09:00 до 16:00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Никоненко Игорь Валерьевич 8 (02340) 30244, Седько Валентина Александровна +3752966002428.

УНП 390477566

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов 2025.Г.002.00032 по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Первомайскому району г. Минска: г. Минск, ул. Седых, 12, тел. 80173955536.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 28.02.2025** в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Легковой автомобиль SKODA FABIA KOMBI, 2010 г. в., тип – легковой универсал, кузов (рама) № TMBJC45J5B3125792, цвет – синий, инв. № 01510163. Выданы регистрационные знаки для транспортных средств, временно допущенных к участию в дорожном движении, – 7ХIТ2498. Местонахождение имущества: г. Минск, ул. Седых, 12.

**Начальная цена:** 4786,67 бел. руб. **Задаток:** 478,67 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.02.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09:00 до 16:00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375296549815 (Лукашевич Наталия Ивановна).

УНП 390477566

НАША — НАЙЛЕПШАЕ!

# ДУХМЯНЫ ГОНАР ВІЦЕБСКАЙ ЗЯМЛІ

**Хлеб «Каравай Прыдзвіння» ААТ «Віцебскхлебпрам» адзначаны Дзяржаўным знакам якасці**

У 2022 годзе ў паўночным рэгіёне з'явіўся новы хлебны сімвал — цёмны бохан пад прыгожай назвай «Каравай Прыдзвіння». Ідэя стварэння такой візітнай карткі вобласці прыйшла кіраўніку рэгіёна Аляксандру Субоціну, падтрымаў ініцыятыву гендырэктар ААТ «Віцебскхлебпрам» Міхаіл Рог. Двухкілаграмовы духмяны бохан хутка знайшоў папулярнасць не толькі ў жыхароў, але і ў шматлікіх замежных гасцей Віцебшчыны. А ў 2025 годзе хлеб «Каравай Прыдзвіння» атрымаў самую высокую ўзнагароду — Дзяржаўны знак якасці.



Фота БелТА.

Менавіта гэты від хлеба адзначаны на ўзроўні краіны невыпадкова: на яго падрыхтоўку патрэбна больш за 20 гадзін. Для каравая выкарыстоўваюць тры віды мукі і некалькі відаў заварак (гэта калі муку заварваюць). Кожны са складнікаў будучага хлеба павінен дайсці за пэўны час да патрэбнага стану, і толькі потым пачынаецца замес цеста. У працэсе вытворчасці такога хлеба віцебскія прафесіяналы спяшацца не любяць — трэба, каб кожная з заварак настаялася і перадала гатоваму прадукту ўнікальны смак, якога няма ні ў адным з іншых хлябоў.

Хлеб, падобны на той, які раней бабулі-гаспадыні выпякалі ў вясковых печках, цяпер будуць упрыгожваць яшчэ адным адмысловым малюнкам — сімвалам Дзяржаўнага знака якасці.

Па словах **галоўнага тэхнолага прадпрыемства Таццяны КАВАЛЕНКА**, атрыманая з рук кіраўніка дзяржавы ўзнагарода — самая высокая і значная ацэнка для ўсяго калектыву. «Гэта вельмі ганарова і адказна для нашага прадпрыемства. Асабліва прыемна, што Дзяржаўным знакам якасці адзначаны менавіта «Каравай Прыдзвіння». Выпускаем мы больш за 30 найменняў жытнёва-пшанічных відаў хлеба. Плюс каля 20 найменняў пшанічных відаў, шырокі асартымент здобных булачных вырабаў», — адзначыла галоўны тэхнолаг.

Спыняцца на дасягнутым майстры хлебнай справы паўночнага рэгіёна не збіраюцца: у 2025 годзе «Віцебскхлебпрам» плануе пашырыць лінейку данага хлеба. Распрацавана рэцэптура каравая з ільном. Акрамя таго, у канцы 2024 года на заводзе распрацавалі рэцэптуры лінейкі пшанічных відаў хлеба з кедровымі арэхамі, вішняй і журавінамі, з насеннем «Мікс». Ёсць яшчэ рэцэптуры цікавых хлябоў з морквай і гарбузом.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# МЕСЦЫ Ў САНАТОРЫЯХ ПУСТАВАЦЬ НЕ БУДУЦЬ



## КОЛЬКІ БУДЗЕ КАШТАВАЦЬ ПУЦЁЎКА?

Што датычыцца цэн, то для пуцёвак Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні кошт аднаго ложка-дня складзе 61,5 рубля. Для пуцёвак у свабоднай рэалізацыі прагназуецца рост у межах макраэканамічных паказчыкаў. У першым квартале, напрыклад, яна складае каля 110 рублёў, гэта ніжэй за паказчык снежня 2024 года.

Сярэдні кошт аднаго ложка-дня летась па пуцёўцы, набытай за сродкі бюджэту, складаў 54 рублі. У свабоднай рэалізацыі кошт у сярэднім быў напалову большы — 110 рублёў.

## РЭКОРДНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

Пачынаючы з 2006 года, калі была праведзена рэформа сістэмы санаторна-курортнага лячэння, мінулы год для беларускіх здраўніц стаў рэкордным па ўсіх паказчыках. Напрыклад, выручка ад санаторна-курортных паслуг у 2024 годзе павялічылася больш як на 24 % і перасягнула 1 мільярд 8 мільёнаў рублёў. На 70,5 тысячы (больш чым на 10 %) павялічылася колькасць пуцёвак, набытых у свабоднай рэалізацыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аналагічная тэндэнцыя прасочваецца і па экспарце лячэбна-аздараўленчых паслуг. Атрымана самая высокая выручка з 2006 года. Рост экспарту склаў 29 %, і сума выручкі ад гэтых паслуг перасягнула 402 мільёны рублёў. Колькасць замежных грамадзян, якія прайшлі санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне ў нашых санаторыях, таксама дасягнула рэкорднай лічбы — 246,5 тысячы чалавек, якая ў параўнанні з мінулым годам вырасла на 29 тысяч.

**Уласнікі ўстаноў аздараўлення і дзяржаўныя ўстановы ідуць у нагу з часам, і шмат сродкаў укладзена ва ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. На гэта было выдзелена больш як 219 мільёнаў рублёў, што амаль у паўтара раза больш, чым у мінулым годзе.**



Максімальных значэнняў дасягнула сярэднегадавая запаўняльнасць — яна склала 84,3 %. Усяго ж санаторна-курортнае лячэнне ў нашых установах прайшлі 1 мільён 565 тысяч чалавек. Навагоднія святы здраўніцы таксама адпрацавалі з максімальнай загрузкай: у гэты час санаторыі наведала звыш 26 тысяч чалавек, з іх — каля 11 тысяч замежных грамадзян.

— Улічваючы, што пастаўлена задача менавіта па нарошчванні эканамічнага складальніка, хачу адзначыць, што былі выкананы ўсе сацыяльныя праекты і дзяржаўныя праграмы. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання былі аздароўлены і прайшлі лячэнне больш як 807 тысяч жыхароў Беларусі. Прыярытэтным кірункам, як заўсёды, у нас застаецца аздараўленне і лячэнне дзіцячага насельніцтва. Сёння ўсе дзеці, якія маюць патрэбу, паказанні і адсутнасць супрацьпаказанняў на лячэнне або аздараўленне, на працягу года яго атрымалі. Гэта датычыцца і дзяцей, якія жывуць на забруджаных тэрыторыях, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі.

## ІЛЬГОТЫ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Адметна, што летась амаль на пяць тысяч чалавек у параўнанні з 2023 годам павялічылася колькасць пенсіянераў, накіраваных у санаторыі за кошт рэспубліканскага бюджэту.

— Гэта дынаміка таксама адна з самых істотных за апошнія гады. Мы будзем і далей нарошчваць колькасць пуцёвак для такіх катэгорый грамадзян. Што датычыцца льгот і зніжак, у адпаведнасці з указам інваліды I і II групы маюць права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне адзін раз на два гады. Пенсіянеры з сярэдняй статыстычнай пенсіяй, як правіла, аплачваюць каля 15—20 % ад кошту пуцёўкі ў залежнасці ад сезона, — нагадаў Генадзь Балбатоўскі.

**На люты ў беларускіх санаторыях забраніравана 71 % месцаў, на сакавік — 68 %, на красавік — 62 %, на май — 52 %. Ужо адкрыта браніраванне на летні перыяд.**

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШАНАВАЦЬ СВАЁ

## У чым перавагі беларускай касметыкі?

Навукаёмістая, эфектыўная касметыка — хоць і не жыццёва важны сегмент, але, безумоўна, той, які мае ўплыў на якасць жыцця, да якога прывык сучасны чалавек. Пра тое, што сёння прапануюць беларускім жанчынам айчынныя вытворцы прафесійнай касметыкі, мы спыталі ў кандыдата біялагічных навук, спікера міжнародных кангрэсаў па касметыцы і медыцыне Людмілы КАЛАЦКАЙ.



***— Людміла Міхайлаўна, што адбываецца сёння на беларускім рынку касметыкі, у першую чаргу прафесійнай? Звыклыя прафесійныя сродкі заходніх вытворцаў сталі даражэйшымі, а іх асартымент скараціўся...***

— Айчынны рынак касметыкі сёння перажывае змены. Многія заходнія і карэйскія брэнды сталі даражэй, а спажывец шукае прадукты, якія сумяшчаюць цэнавую даступнасць і эфектыўнасць. Але беларускім жанчынам у гэтых адносінах, я лічу, пашанцавала: практычна ўсё неабходнае для захавання прыгажосці і маладосці выраблялецца ў нашай краіне. Гэта высакаякасная касметыка даступнага цэнавога сегмента — не стамляюся паўтараць, што «Беліта-Вітэкс» на сённяшні дзень найлепшая касметыка мас-маркета ва Усходняй Еўропе. Навуковы цэнтр «Беліта-Вітэкс» і ў цэлым калектыў гэтай кампаніі — прафесіяналы, якія ствараюць сапраўды вельмі годныя і эфектыўныя прадукты. А ў апошняе дзесяцігоддзе ёсць у беларускіх жанчын і прафесійная айчынная касметыка, і касмецэўтыка (інавацыйныя прэпараты на стыку касметыкі і фармацэўтыкі). І тут гаворку трэба весці не толькі аб імпартазамяшчэнні, і не толькі аб неапраўдана высокіх цэнах на сусветныя касметычныя брэнды. Справа ў тым, што айчынныя касметычныя прэпараты распрацоўваюцца так, каб максімальна адпавядаць нашаму метабалізму, рэгіёну, асаблівасцям нашай скуры. Так што цяпер трэба навучыцца шанаваць і паважаць сваё замест чужога, звяртаць увагу не на брэнд, а на састаў прадукту. Тым больш што коштавая палітыка беларускіх вытворцаў касметыкі (і ў сегменце мас-маркета, і ў прафесійным) накіравана на тое, каб догляд быў па кішэні спажыўцам практычна з любым узроўнем даходу. Але магу канстатаваць, што да гонару нашых жанчын яны, як правіла, адукаваныя, разбіраюцца ў тым, чаго хочуць ад касметыкі, умеюць чытаць састаў, адрозніваць якасць ад «рэкламных хітрыкаў».

**Індустрыя прыгажосці не можа існаваць па-за кантэкстам жыцця, яна не «лунае ў бязважкасці». Таму і новыя трэнды заўсёды маюць аб'ектыўныя прычыны з'яўлення, сацыяльны і эканамічны падмурак.**

***— Калі ўжо зайшла размова аб цэнах... Сёння, сапраўды, многія шукаюць прадукты, якія маглі б сумяшчаць у сабе даступны кошт і эфектыўнасць. Але ці магчыма гэта — каб адносна недарагая касметыка магла канкурыраваць з прафесійнай?***

— Прафесійныя прадукты звычайна не даступныя шырокаму колу спажыўцоў, і не толькі з-за высокага кошту. Такія сродкі і ў Беларусі, і ў іншых краінах прадаюць толькі прафесіяналам з адпаведнай адукацыяй: з прычыны высокай актыўнасці яны могуць быць небяспечныя ў руках чалавека, які не мае неабходных ведаў: можна нанесці сваёй скуры шкоду. Так што наведванне касметолага (няхай і нячаста) павінна стаць ужо гадоў з трыццаці абавязковым пунктам клопату пра сябе кожнай жанчыны, у адным шэрагу з правільным харчаваннем і кантролем вагі, фізічнай актыўнасцю, адмовай ад шкодных звычак. Але адна з тэндэнцый індустрыі прыгажосці апошніх гадоў — разбурэнне меж паміж прафесійнай касметыкай і сродкамі хатняга догляду. Іншымі словамі, стварэнне сродкаў інавацыйных і высокаэфектыўных, але бяспечных у хатнім ужыванні. Беларусь не засталася ў баку ад гэтага трэнду.

**Адна з тэндэнцый індустрыі прыгажосці апошніх гадоў — разбурэнне меж паміж прафесійнай касметыкай і сродкамі хатняга догляду. Іншымі словамі, стварэнне сродкаў інавацыйных і высокаэфектыўных, але бяспечных у хатнім ужыванні.**

***— Атрымліваецца, што трэнды ў касметыцы ўзнікаюць як свайго роду адказы на глабальныя пытанні сучаснасці?***

— Так, паколькі індустрыя прыгажосці не можа існаваць па-за кантэкстам жыцця, яна не «лунае ў бязважкасці». Таму і новыя трэнды заўсёды маюць аб'ектыўныя прычыны з'яўлення, сацыяльны і эканамічны падмурак. І адказныя вытворцы гэта ўлічваюць і ў канчатковым прадукце, і ў прынцыпах яго распрацоўкі і вытворчасці. Можна сказаць, што трэнды ў індустрыі прыгажосці — гэта адказы на ключавыя выклікі сучаснасці. Напрыклад, гэта экалагічная адказнасць — чыстая вытворчасць, біяраскладальная ўпакоўка. Гэта адказнасць перад людзьмі — выбар толькі якаснай сыравіны, бяспека прадукту для спажыўца. Гэта коштавая палітыка. Гэта поўная інфармацыя аб прадукцыі, яе саставе, адсутнасць магчымасці скажэнняў або розначытанняў. Часам спажывец не давярае касметыцы сярэдняга коштавага сегмента: «таннае не можа быць якасным». Але прамая ўзаемасувязь паміж коштам і якасцю крэму, пілінгу, сывараткі ёсць не заўсёды.





**Коштавая палітыка беларускіх вытворцаў касметыкі (і ў сегменце мас-маркета, і ў прафесійным) накіравана на тое, каб догляд быў па кішэні спажыўцам практычна з любым узроўнем даходу.**

Для беларускіх вытворцаў характэрная адказная цэнавая палітыка. Між тым прадукцыя праходзіць дбайныя лабараторныя даследаванні і праверкі, адпавядае міжнародным стандартам якасці. Так што чытайце састаў, і ў вас, упэўнена, з'явіцца пытанне: ці варта пераплачваць «за імя», калі не менш якасны прадукт ад беларускага вытворцы абыдзецца значна танней?

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ Ў ДАПАМОГУ

Аўтаматызацыя вытворчасці — важная ўмова забеспячэння стабільна высокай якасці вырабаў, упэўнены на БЕЛАЗе. Таму тут імкнуцца крочыць у нагу з патрабаваннямі часу.



Чатыры сучасныя металаапрацоўчыя станкі ўкаранёны ў вытворчы працэс у рамках рэалізацыі інвестыцыйнай праграмы па мадэрнізацыі станочнага парка БЕЛАЗа.

Станкі ўведзены ў эксплуатацыю ў інструментальным цэху прадпрыемства замест ручнога металарэзнага абсталявання.

Трэба сказаць, што новае абсталяванне прызначана для апрацоўкі і вырабу інструмента і тэхналагічнага абсталявання, у прыватнасці, вырабаў складанай формы для прэс-формаў, габарытаў станочных і зборачна-зварачных прыстасаванняў для пэўных дэталяў машын і іншага, расказалі на прадпрыемстве.

Напрыканцы трэба адзначыць, што металаапрацоўчыя станкі з'яўляюцца важнай часткай сучаснай аўтаматызацыі — ключавой умовай забеспячэння стабільна высокай якасці вырабаў і хуткасці вытворчых аперацый.

* * *

# СТАЎКА НА РАЗВІЦЦЁ

ЗАТ «АТЛАНТ» рыхтуецца да запуску навінкі — пральнай машыны 18-га інтэрфейсу з інвертарным рухавіком



Прадпрыемства актыўна аптымізуе прадуктовую лінейку: старыя інтэрфейсы сыходзяць у мінулае, а інавацыйныя з актуальным дызайнам папаўняюць мадэльную лінейку.

— «АТЛАНТу» тэхнічны апгрэйд неабходны, каб быць канкурэнтаздольным, — упэўнены на прадпрыемстве. — Інвертарныя рухавікі больш надзейныя і даўгавечныя, эканамічныя і эфектыўныя дзякуючы высокай хуткасці кручэння і меншаму выдатку электраэнергіі. Ціха працуюць. Пральныя машыны з інвертарным рухавіком больш дакладныя ў рэгуляванні хуткасці кручэння, што дазваляе даць спажыўцу большы выбар праграм мыцця і дадатковых опцый для розных відаў тканін.

Як патлумачылі на прадпрыемстве, зараз эксперыментальная партыя праходзіць апошнія выпрабаванні ў навукова-галіновай лабараторыі і ў іншых арганізацый. Далей — атрыманне сертыфікатаў, пастаноўка ў план вытворчасці і першыя продажы.

**Віталь КУТУЗАЎ:**

# «ПРАЦЯГВАЮ СТАВІЦЬ НОВЫЯ МЭТЫ І ДАСЯГАЦЬ ІХ»

## Як вядомы футбаліст стаў пісаць кнігі



Многім аматарам айчыннага футбола Віталь Кутузаў вядомы як адзін з найлепшых гульцоў свайго пакалення. За 38 гадоў у прафесіі наш герой перажыў шмат і навучыўся многаму, меў магчымасць убачыць свет і пераймаць вопыт у вялікіх майстроў. І цяпер усім гэтым ён дзеліцца ў сваёй кнізе «У патоку «Хвалі». Выданне не толькі знаёміць шырокую аўдыторыю чытачоў з жыццёвым шляхам вядомага спартсмена, але і па-сапраўднаму натхняе на веру ў сябе, свае мары і дае, лічыце, дарожную карту для іх дасягнення. А вось пра тое, як вялася работа над кнігай, ад чаго залежыць поспех сапраўднага мужчыны і ці можна развітацца са спортам назаўсёды, мы распыталі нашага героя пры асабістай сустрэчы.

***— Віталь Уладзіміравіч, зараз многія спартсмены запускаюць нейкія курсы, свае школы адкрываюць, каб дзяліцца вопытам. Чаму вы абралі фармат кнігі?***

— Кніга дае магчымасць ахапіць значна большую аўдыторыю людзей. Плюс яна ні да чаго не абавязвае чалавека. Ён можа проста ўзяць яе ў бібліятэцы альбо купіць у краме і знайсці ў ёй для сябе нейкія важныя, патрэбныя думкі. Чытачом можа быць тата, мама, трэнер, само дзіцця. Прычым адны ў працэсе чытання могуць зацікавіцца футболам, а іншыя знойдуць там для сябе адказы на пытанні, якія іх непакояць. Дык я лаўлю зваротную сувязь, калі мне шмат пішуць у тых жа сацыяльных сетках. І калі ёсць запыт на такую інфармацыю — значыць, трэба яго задаволіць, што мы і зрабілі. Далі веды, якія будуць цяпер у кожнага ў крокавай даступнасці. І самае галоўнае, я лічу, гэтая кніга дазваляе людзям паверыць у сябе, паколькі ў ёй ёсць шмат псіхалогіі. Выданне базіруецца на гэтым. Нават калі ўзяць саму назву «У патоку «Хвалі». У самой хвалі няма патоку, а ёсць сіла і вышыня, а паток — гэта ўсяго толькі вызначэнне нашага нейкага псіхалагічнага стану. Лічу, што толькі ў патокавым стане можна апынуцца на вяршыні, крэатыўць, ствараць — словам, быць творцам у той вобласці, дзе вы рэалізоўваецеся.

***— Шмат часу вам спатрэбілася на напісанне кнігі? Як адбываўся гэты працэс?***

— Калі нешта робіш упершыню, то заўсёды гэта складана. Але вялікае жаданне пераадольвае любыя цяжкасці. Ідэя ў мяне з'явілася даўно, але не адразу прыйшло разуменне, як яе рэалізаваць. Баяўся і згубіць нейкую інфармацыю, бо памяць з гадамі заціраецца. Таму некаторыя рэчы ўспомніў у працэсе і не змог уключыць іх у кнігу. Нешта ўспамінаецца і цяпер, асабліва калі з людзьмі з мінулых часоў сустракаешся. Напрыклад, адзін мой знаёмы, з якім мы гулялі ў дзяцінстве, нядаўна расказаў, што калі аднойчы зайшоў да мяне, то я сядзеў і нешта пісаў. А на яго пытанне: «Што ты робіш?» — адказаў: «Вучуся аўтографы даваць!» Тады, вядома, маім словам ніхто не надаў значэння, аднак цяпер іх ацэньваеш ужо зусім па-іншаму. Але асноўную інфармацыю я ў кнігу ўключыў, згадаў людзей, з якімі мяне звodзіў лёс. Плюс там ёсць свая філасофія, маё пасланне, якое я хацеў перадаць шырокай аўдыторыі.

***— Ваша кніга — прадукт, у якім аб'яднаны культура і спорт. Праекты такога кшталту сёння ў тым ліку спрыяюць папулярызацыі абедзвюх сфер. Ці дастаткова такіх крокаў і што, на вашу думку, яшчэ можна зрабіць для папулярызацыі футбола?***

— Я асабіста раблю тое, што ў маіх сілах. Імкнуся быць карысным у гэтай сферы, скарыстоўваючы свае веды, магчымасці, кантакты. І мая кніга — таксама адна з маленькіх цаглінак, якія патрэбны для пабудовы чагосьці трывалага і годнага. Усяму патрэбныя цэмент, фундамент, але без маленькіх цаглінак усё не мае сэнсу. Зразумела, што і я не дзейнічаю адзін. І калі будуць знаходзіцца людзі, арганізацыі з жаданнем рабіць свой унёсак, то сітуацыя і з футболам, і з запаўняльнасцю стадыёнаў пачне змяняцца.

Я і кнігу напісаў, каб перадаць свае веды. Мне такога выдання ў свой час не хапала, а хацелася знаходзіць інфармацыю, разумець, як паводзіць сябе ў нейкай сітуацыі. Такая кніга дапамагла б мне зрабіць зусім іншы віток у маім развіцці як асобы, так і футбаліста. А калі разглядаць футбольную галіну глыбей, то там можа быць значна больш вузканакіраваных прадуктаў для спартсменаў. Аднак калі ў нас губляецца хоць адна дэталь, то і агульнай карціны ўжо не будзе.

***— У сваёй кнізе вы пішаце пра тое, што калі галоўнае месца ў вашым жыцці заняў футбол, то ўсё астатняе было другарадным. А як вызначалі прыярытэты для сям'і, сяброў, асабістага жыцця?***

— На ўсіх знаходзіў час, але калі ўжо з'яўляецца адказнасць там і там, то ты як прафесіянал можаш адчуваць сябе камфортна, маючы за спінай вялікую арганізацыю. І тады, як у мяне было, яна дапамагае табе ва ўсім: адаптавацца, вырашаць праблемы сям'і і г. д. Таму што ім патрэбен футбаліст, у якога няма праблем, які поўнасцю сканцэнтраваны на гульні і можа максімальна сябе аддаць. Ты — іх актыў, пра які яны клапоцяцца, каб выкарыстаць твае магчымасці на поўную. І таму там прафесійны футбаліст можа атрымліваць асалоду ад жыцця і працы.

***— У сваёй гісторыі вы таксама згадваеце сваіх сястру, маму. Скажыце, наколькі моцны ўплыў яны аказалі на ваша станаўленне?***

— Галоўнае, што мне тады ніхто з родных не перашкаджаў. Вельмі важна даць вашаму дзіцяці магчымасць займацца тым, што яму падабаецца. Дапамажыце знайсці занятак па душы і пасля дайце свабоду ў выбары, для росту. Мая маці, напрыклад, поўнасцю давяралася маёй школе. Заўсёды падтрымлівала, калі нешта не атрымлівалася. А я, у сваю чаргу, таксама імкнуўся быць адказным. Таму я вельмі ўдзячны сваім блізкім людзям, што дапамагалі мне рухацца па жыцці.

***— А лёгка было вам адбівацца ад прыхільніц, бо, верагодна, з поспехамі ўзрастала і ўвага да вас з боку дзяўчат? Як знайшлі свайго чалавека?***

— Адбівацца было складана *(смяецца)*, але мне хацелася знайсці сваю палавінку. Чалавека, які будзе падтрымліваць, раздзяляць мае погляды на розныя рэчы. Вельмі важна, каб побач была тая жанчына, якая цябе разумее і чуе, умее падбадзёрыць у патрэбны момант. І я заўсёды быў шчаслівы ў адносінах з жанчынамі. І імкнуўся ў адказ таксама дзяліцца шчасцем, заставацца шчырым, аддаваў сям'і ўсё, што магу. І цяпер раблю тое ж самае.

***— Жанчына аказвае ўплыў на поспех мужчыны?***

— Жанчына павінна быць для мужчыны апірашчам, пра існаванне якой ён ведае. І калі гэта ёсць, то ты проста можаш ісці і спакойна займацца сваімі справамі, ствараць нешта. У гэтым, лічу, сутнасць узаемаадносін.

***— Здараліся ў вашым жыцці моманты выпрабавання зорнай хваробай? І на чым сканцэнтраваны зараз?***

— Думаю, часам моманты, калі ты нібы проста адлятаеш у космас, прысутнічаць у жыцці кожнага чалавека. Усё ладзіцца, і адчуваеш шчасце. Хоць здараюцца і расчараванні. Мне пашчасціла, паколькі я быў там, дзе нельга мяняцца. Таму што побач заўсёды людзі, якія таксама ўсё прайшлі. А значыць, проста вяртаешся кожны раз на выхадную пазіцыю і ідзеш далей. Мне аднойчы адзін трэнер сказаў: «Мясарубка ніколі не выключаецца, таму, што б ні адбылося, трэба працягваць працаваць. І штораз даказваць сваё права быць там, дзе ты знаходзішся». А галоўнае, каб, азіраючыся на зробленае, ты разумеў, што зрабіў усё, што ад цябе залежыць, і табе не сорамна.

І цяпер я працягваю ставіць перад сабой новыя мэты і дасягаць іх. Пачаў гуляць у хакей, працягваю гуляць у шахматы, раблю шмат цікавых рэчаў для футбольных клубаў. Хочацца мяняць індустрыю спорту да найлепшага.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва героя.**


**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона)
**по поручению ОАО «Гомельский домостроительный комбинат»** (продавец)
**извещает о проведении**

**4 марта 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества в **12.00** по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

НАИМЕНОВАНИЕ ИМУЩЕСТВА

Лот №1: **изолированное помещение** с инв. № 350/D-347323 площадью 117,4 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, расположенное на земельном участке с кадастровым № 340100000001005931 площадью 0,1630 га по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Мазурова, 15. Заключен договор аренды от 13.05.2019 г. № 3-А/19 сроком по 19.05.2025 г.

**Начальная цена** продажи с НДС – **477 900,00** бел. руб.
**Задаток** с НДС – **5 000,00** бел. руб.

**Продавец:** ОАО «Гомельский домостроительный комбинат», г. Гомель, ул. Лазурная, 17. Контактный телефон +375 (29) 199-44-99.
**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.** Для участия в аукционе необходимо: **1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца: р/с BY12BLBB30120400071166001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071166.
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 03.03.2025 г. в 16.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) банковских дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в следующем порядке: **30 %** – в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, оставшуюся часть – в течение **20 (двадцати)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов 0,9 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости объекта. Аукцион проводится в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона)
**по поручению Лоевского РайПО** (продавец)
**извещает о проведении**

**12 февраля 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 часов по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот №1**: **капитальное строение** с инв. № 340/С-290109 общей площадью 376,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/4. Капитальное строение с инв. №340/С-369 общей площадью 240,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/5. Капитальное строение с инв. №340/С-3720 общей площадью 113,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/6. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001000005.
**Начальная цена** продажи без НДС **– 31 040,00 бел. руб.** без НДС.
**Задаток 1 % – 310,40 бел. руб.**

**Условие продажи:** имеется необходимость в последующем выделении земельного участка, необходимого для обслуживания и эксплуатации объектов недвижимости. После проведения торгов Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка, необходимого для обслуживания предмета торгов, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению (выделению) земельного участка и прав на него, государственной регистрации и удостоверению договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет торгов возлагаются на Покупателя.
**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Батова, 59. Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.
**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**
Для участия в аукционе необходимо: **1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11.02.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителями, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

ПРЭМ'ЕРА

# НОВЫЯ ТАЛЕНТЫ — НА «ФАКТАР.BY 60+»

Сёння ўвечары на тэлеканале «Беларусь 1» гледачоў чакае прэм'ера трэцяга сезона ўжо любімага многімі музычнага шоу «Фактар.by 60+». А значыць, вакалісты элегантнага ўзросту зноў выйдуць на сцэну, каб у чарговы раз давесці, што сапраўдны талент і мары не маюць тэрміна даўнасці.




Праект дае магчымасць скарыць прафесійную сцэну артыстам паважанага ўзросту, многія з якіх упершыню выступяць перад шырокай аўдыторыяй. У гэтым сезоне да этапу тэлекастынгаў дайшлі 24 удзельнікі, а ўжо іх лёс на шоу будзе вызначаць кампетэнтнае журы. Па-ранейшаму туды ўваходзяць Аляксандр Саладуха, Віктар Бярэзін, Вікторыя Алешка і Аляксандра Гайдук. Менавіта яны будуць вырашаць, хто пройдзе далей. У сваю чаргу канкурсанты поўныя энергіі і энтузіязму, каб здзіўляць глядачоў і журы сваімі гісторыямі і яркімі выступленнямі.

На сцэне і за кулісамі на працягу шасці тыдняў праекта падтрымліваць удзельнікаў будуць вядучыя Павел Лазовік і Алена Спірыдовіч. Таму глядзіце новы сезон шоу па пятніцах на тэлеканале «Беларусь 1» у вячэрнім эфіры. Прэм'ерны першы выпуск сёння ў 20.50. Калі ж хочацца даведацца больш пра закуліссе праекта і бліжэй пазнаёміцца з яго ўдзельнікамі, то глядзіце дзённікі шоу.

НАДВОР'Е

# ЛЮТЫ АПРАЎДАЕ СВАЮ НАЗВУ

## На наступным тыдні — да мінус 13

Анамальна цёплае, амаль вясновае надвор'е ўсталявалася ў Беларусі на заключным тыдні студзеня. Аднак з прыходам лютага сітуацыя ў атмасферы пачне змяняцца, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



Сёння будзе воблачна з праясненнямі. У начны і ранішні час у асобных раёнах можа быць слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 °С да плюс 5 °С, днём — ад 4 да 10 цяпла.

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, з прыходам лютага сітуацыя ў атмасферы пачне змяняцца. У суботу тэрыторыю нашай краіны перасячэ халодны атмасферны фронт. Тэмпература будзе паніжацца, а ноччу стане ад 1 да 8 марозу. У асобныя ночы пры ўмове працяглых праясненняў не выключана паніжэнне да мінус 10—12 °С. Дзённыя максімумы будуць вагацца ад мінус 5 °С да плюс 2 °С. На непрацяглы час яшчэ можа ўсталявацца снежнае покрыва.

1 лютага на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). Уначы і раніцай месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. У асобных раёнах будзе ўзмацненне ветру парывамі 15—18 м/с. Тэмпература паветра ноччу будзе ад мінус 2 °С да плюс 4 °С, днём — ад нуля да 5 цяпла.

У нядзелю месцамі ноччу і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе ад 0 да мінус 5 °С, днём — ад мінус 4 °С да плюс 2 °С.

У панядзелак у многіх раёнах краіны прагназуецца кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе 1-7 градусаў ніжэй за нуль, днём — ад мінус 4 °С да плюс 2 °С.

У аўторак месцамі ноччу і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца кароткачасовы снег, у тым ліку і мокры. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе складаць 1—7 марозу, пры праясненнях — да мінус 10 °С. Днём будзе ад мінус 5 °С да плюс 1 °С.

У сераду, 5 лютага, месцамі па Беларусі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе 2—8 марозу, пры праясненнях — ужо насамрэч зімовыя да мінус 13 °С. Днём будзе ад мінус 5 °С да плюс 1 °С.

## Панядзелак, 3 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 07.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона Х (16+).
**9.15** Галоўны эфір.
**10.50, 12.25 Меладрама «Зводныя сёстры» (12+).**
**13.20, 15.15 Меладрама «Без цябе» (12+).**
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10, 22.05 Серыял «След» (16+).**
**20.00** Адзін дзень (12+).
**20.30** «Нашы ў КХЛ». Тэлефільм (12+).
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.15** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10 «Белыя Росы» (12+).**
**12.40, 13.15, 22.50 Фільм «Бумеранг» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Прапаганда» (16+).
**21.40 Фільм «Вугаль» (16+).**
**0.50** «Твар у твар» (16+).
**1.30** Час.

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 8.45** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.20** «Слова і справа».
**10.45** Дак. праект «Неверагодная навука» (12+).
**13.50 «Вышук-3». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Адміралы раёна-2». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «Пытанні ад бландзінак».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Пенсільванія». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.50 «Другое паўстанне Спартака». Серыял (16+).**

### МІР

**5.00, 6.15, 10.20 Тэлесерыял «Начныя ластаўкі» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**10.10** «Беларускі стандарт» (12+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**20.55** «Гульня ў кіно. Чэмпіянат свету» (16+).
**21.40** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.25 Маст. фільм «Стары знаёмы» (16+).**
**0.05** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**1.05** Першы Еўразійскі канал (12+).
**2.00 Маст. фільм «Антоша Рыбкін» (16+).**
**2.50 Маст. фільм «Чакай мяне» (16+).**
**4.20 Маст. фільм «Сталінград» (16+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05** Выбары-2025 г. (12+).
**5.30, 6.35** Навіны эканомікі (12+).
**5.35, 6.40, 7.50, 8.45, 13.35** Прэс-агляд (12+).
**5.40, 6.45** Меркаванне клуба (12+).
**5.55, 7.45, 9.50** Тэхнагайд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.55** Громаў LIVE (12+).
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 19.50** Навіны.
**7.40, 8.40, 8.50, 9.45, 10.50, 11.30, 11.55, 12.30, 13.40, 14.40, 15.25, 16.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**9.40, 18.40, 22.50** Баявое дзяжурства (12+).
**10.10** Вакол планеты (12+).
**11.10, 11.35, 14.10, 21.15** Тэлефільм (16+).
**12.35, 16.15, 17.45, 3.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**12.50, 20.20, 21.55, 0.50, 3.45** Аўтарскі погляд (12+).
**13.45** Твой горад (12+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**14.50, 16.50, 18.50, 0.15, 1.10, 2.10, 3.10, 4.10** Дзень спорту.
**15.15, 18.10, 20.35, 22.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**15.30, 18.30** Навіны рэгіёна.
**19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**20.05, 23.15, 0.35** Зразумелая палітыка (12+).
**23.30, 4.30** Арэна (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Кулагіны» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Акцэнты».
**12.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.45** «Плюс-мінус».
**14.40 Тэлесерыял «Адлюстраванне зоркі» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**17.40 Тэлесерыял «Курорт колеру хакі» (18+).**
**18.45** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** Беларусы (6+).
**6.40** «Навука побач» (6+).
**7.15** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**7.45, 8.25 Драма «Прыкаваны» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.25** Ежа хоць куды (6+).
**13.20, 22.30, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.35 Дэтэктыў «Першы аддзел» (16+).**
**21.15** «НЗ.by».
**22.35, 23.45 Серыял «Шэф. Мужчынская работа» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.00, 13.00, 16.15, 20.25, 22.55** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Шыфр-3». Маст. фільм (16+).**
**10.05** «Культурны тыдзень».
**10.40, 19.05 «Мама выйшла замуж». Маст. фільм (12+).**
**12.05** «Нацыянальны хіт-парад».
**13.10 «На іншым беразе». Маст. фільм (12+).**
**15.10** «Наперад у мінулае».
**15.50** «Навука побач» (6+).
**16.25** «Жывая спадчына».
**16.50 «Я родам з дзяцінства». Маст. фільм (12+).**
**18.25** «Апошні дзень» (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05** «Суразмоўцы».
**23.20** «Леанід Шварцман. Казка пра хлопчыка і стары горад». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

**6.55** Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Сібір» (Новасібірск).
**8.50** Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
**10.35** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Авангард» (Омск).
**12.20, 22.30** Бокс.
**14.55** Баскетбол. Адзіная ліга. «Енісей» (Краснаярск) — «Уралмаш» (Екацярынбург).
**16.10** Вынікі тыдня.
**16.50** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Металург» (Магнітагорск). У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**19.20** VeloLove.
**19.40** Спорт-цэнтр.
**19.50** Змешаныя адзінаборствы.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.55, 13.20, 16.55** Тэлебарометр.
**10.00 Дэтэктыў «Абанемент на расследаванне. Знакі лёсу» (16+).**
**13.50** «Дзіця з пекла» (16+).
**14.50** «Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2» (0+).
**16.05** Мультсерыял «Кацяня Шмяк» (0+).
**16.25** «10 самых...» (16+)
**17.00 Меладрама «Улётны экіпаж-2» (16+).**
**18.40** «Карысная праграма» (16+).
**18.55** Суд вырашыць (16+).
**19.55** «Сляпая» (16+).
**20.25 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Дэтэктыў «Дама з сабачкам-2» (16+).**
**23.10 Дэтэктыў «Мажор» (16+).**
**0.05** «Сям'я. Перазагрузка». Дак. драма (16+).

## Чацвер, 6 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45, 22.10** Зона Х (16+).
**8.50** Слова Мітрапаліта Веніяміна на дзень месцашанаванай святой Валянціны Мінскай і святой блажэннай Ксеніі Пецярбургскай.
**9.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10, 22.25 Серыял «След» (16+).**
**12.25** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.15 Меладрама «Чужое шчасце» (16+).**
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Пасля многіх бед» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** На кантролі Прэзідэнта (12+).

### АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**11.25** «Модны прыгавор» (6+).
**12.25, 13.15, 22.30 Фільм «Бумеранг» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20 «Вугаль». Фільм (16+).**
**0.30** Час.

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 8.45** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
**10.45** Дак. праект «Таямніцы космасу» (12+).
**13.50 «Вышук-3». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Адміралы раёна-2». Серыял (16+).**
**19.15** «Свае».
**20.15** «Накіпела».
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Апошні артыкул журналіста». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.50 «Другое паўстанне Спартака». Серыял (16+).**

### МІР

**5.00, 3.20 Тэлесерыял «Школа выжывання ад самотнай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.10** «Народжаны ў СССР». Палад Бюльбюль аглы (16+).
**6.35, 0.05** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**7.00 Маст. фільм «Не бойся, я з табой!» (16+)**
**10.10, 17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**11.00, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**11.55, 14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**20.55** «Гульня ў кіно. Чэмпіянат свету» (16+).
**21.40** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.25 Маст. фільм «Яго звалі Роберт» (16+).**
**1.05** Першы Еўразійскі канал (12+).
**1.50 Маст. фільм «Таямнічы востраў».**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.25, 6.05, 6.30, 7.45, 8.40, 8.50, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.40, 14.40, 15.25, 16.30, 17.40, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.10, 5.40, 6.15, 6.40** Навіны эканомікі (12+).
**5.20, 5.50, 6.25, 7.40, 14.50, 16.50, 18.50, 0.15, 1.10, 2.10, 3.10, 4.10** Дзень спорту.
**5.45, 6.50, 7.55, 8.45, 9.50, 10.25, 13.35** Прэс-агляд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 19.50** Навіны.
**9.40, 18.40, 22.50** Баявое дзяжурства (12+).
**10.10, 12.35, 16.15, 17.45, 3.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**10.35, 13.45, 15.15, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15, 0.35** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**11.10, 11.35, 14.10, 21.15** Тэлефільм (16+).
**12.50, 21.55** Аўтарскі погляд (12+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**15.30, 18.30** Навіны рэгіёна.
**18.25, 20.50, 0.50, 3.45** Вам тэлеграм (12+).
**19.35, 20.35, 22.35, 00.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**23.30, 4.30** Арэна (12+).
**01.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Кулагіны» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40 Тэлесерыял «Адлюстраванне зоркі» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**17.40** «Белая студыя».
**18.30** Гумарыстычная праграма.
**18.45** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Серыял «Склifасоўскі» (12+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20, 7.10, 8.25, 13.20, 22.30, 23.30** Сення. Галоўнае.
**6.25** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сення.
**8.35, 21.15** «НЗ.by».
**9.00, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.25** Ежа хоць куды (6+).
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сення. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.35 Дэтэктыў «Першы аддзел» (16+).**
**22.35, 23.45 Серыял «Шэф. Мужчынская работа» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.35** «Беларуская кухня».
**8.00, 13.00, 16.20, 20.25, 22.55** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Шыфр-3». Маст. фільм (16+).**
**10.05** «Палітра Перамогі».
**10.40, 16.40 «Сныніўся цягнік». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Архітэктура Беларусі».
**13.10** «Легенды кіно» (12+).
**13.50 «Паляванне на ліс». Маст. фільм (12+).**
**15.30** «Кадры жыцця».
**16.30** «Асобы».
**18.15** «Апошні дзень» (12+).
